**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Дырэктар
Інстытута журналістыкі БДУ
_______________ С.В. Дубовік
«_26_» _чэрвеня_2012 г.
(дата зацвярджэння)

Рэгістрацыйны № УД- _І-025_/р.

# Курс па профілі
# «СМІ БЕЛАРУСІ Ў СУЧАСНЫМ ІДЭАЛАГІЧНЫМ ПРАЦЭСЕ»

**Вучэбная праграма для спецыяльнасці:**
1-23 01 08-01 – Журналістыка (друкаваныя СМІ)

| | | |
|---|---|---|
| Факультэт | журналістыкі Інстытута журналістыкі | |
| Кафедра | гісторыі журналістыкі | |
| Курс | 4 | |
| Семестр | 7 | |
| Лекцыі | 10 | |
| Практычныя (семінарскія) | 14 | Залік |
| КСР | 2 | |
| Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне | 26 | Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая |
| Усяго гадзін па дысцыпліне | 46 | |

Склаў А.Г. Слука

2012 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове базавай вучэбнай праграмы “СМІ Беларусі ў сучасным ідэалагічным працэсе” для студэнтаў спецыяльнасці “Журналістыка” (друкаваныя СМІ), зацверджанай 03.11.2011 г. (рэгістрацыйны № УД-І-02/баз.)

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння кафедрай гісторыі журналістыкі 15.06.2012 г. пратакол № 11

Загадчык кафедры

_____________ П.Л. Дарашчонак

Ухвалена і рэкамендавана да зацвярджэння вучэбна-метадычнай камісіяй Інстытута журналістыкі БДУ 25.06. 2012 г. пратакол № 10

Старшыня

_____________ В.М. Самусевіч

.

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У спецкурсе «СМІ Беларусі ў сучасным ідэалагічным» працэсе аналізуецца змест і накірункі развіцця палітычных плыняў, ролі камунікацыйных каналаў у развіцці дэмакратыі на пачатку XXI стагоддзя.

Асноўная ўвага надаецца ролі масавых камунікацый ў асэнсаванні новых ідэй, на падставе якіх будзе развівацца грамадства ў бліжэйшым будучым: канцэпцыі ўстойлівага развіцця, ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці і беларускай нацыянальнай ідэі.

Спецкурс спрыяе ўключэнню студэнтаў у самастойны творчы працэс.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

<table>
<tr><th rowspan="3">№</th><th rowspan="3">Тэма</th><th colspan="4">Колькасць аўдыторных гадзін</th></tr>
<tr><th rowspan="2">усяго</th><th colspan="3">У тым ліку</th></tr>
<tr><th>лекцыі</th><th>семін. заняткі</th><th>КСР</th></tr>
<tr><td></td><td>СМІ Беларусі ў сучасным ідэалагічным працэсе</td><td>26</td><td>10</td><td>14</td><td>2</td></tr>
<tr><td>1.</td><td>Навукова-тэарэтычныя асновы сучаснай дэмакратыі.</td><td></td><td rowspan="2">2</td><td rowspan="2">2</td><td></td></tr>
<tr><td>2.</td><td>Ідэалагічныя інстытуты сучаснай палітычнай сістэмы і іх уплыў на фарміраванне новай інфармацыйнай прасторы.</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>3.</td><td>Трансфармацыя свабоды слова – адзін з галоўных фактараў умацавання дэмакратычнага грамадства.</td><td></td><td rowspan="2">2</td><td>2</td><td></td></tr>
<tr><td>4.</td><td>Фарміраванне новай культурнай прасторы – фактары, прынцыпы ўзаемадзеяння ў постіндустрыяльным грамадстве.</td><td></td><td>2</td><td></td></tr>
<tr><td>5.</td><td>Умацаванне духоўнай асновы грамадзянскага супольства ў СМІ Рэспублікі Беларусь для сцвярджэння дэмакратычных прынцыпаў існавання дзяржавы.</td><td></td><td>2</td><td>2</td><td>2</td></tr>
<tr><td>6.</td><td>Развіццё тэорыі эфектыўнай дзяржавы, як галоўны фактар зместу ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. Адлюстраванне ў СМІ.</td><td></td><td rowspan="2">2</td><td>2</td><td></td></tr>
<tr><td>7.</td><td>Эвалюцыя адлюстравання ў СМІ Беларусі праблемы ўстойлівага развіцця краіны на аснове законаў міжнароднага супрацоўніцтва.</td><td></td><td>2</td><td></td></tr>
<tr><td>8.</td><td>Дэмакратычны дыялог дзяржавы і грамадства ў камунікатыўнай сферы - асноўны прынцып пабудовы эфектыўнай дзяржавы.</td><td></td><td>2</td><td>2</td><td></td></tr>
</table>

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

### *Тэма 1. Навукова-тэарэтычныя асновы сучаснай дэмакратыі*

Пераход постіндустрыяльнага ў інфармацыйнае грамадства ўмацоўвае дэмакратычныя прынцыпы існавання чалавецтва. Наступае эпоха гуманізму, навукі і імклівага развіцця сусветнай культуры.

У XX стагоддзі заканчваецца перыяд войн і рэвалюцый, а на змену ім прыходзіць эвалюцыйны шлях развіцця цывілізацыі.

Аднак, каб выкарыстаць аб'ектыўныя магчымасці, грамадству неабходна пераадолець значныя супярэчнасці: спыніць палітычны і эканамічны падзел свету, так званы "новы парадак": амерыканскую і мусульманскую экспансію. вырашаць міжнародныя пытанні мірным шляхам, забараніць захопніцкія ваенныя дактрыны што з'яўляецца рэцыдывамі аўтарытарнай дэмакратыі, і перайсці да новай самарэгулюючайся эканамічнай мадэлі.

Беларусь як самастойная краіна развіваецца ў рэчышчы агульнаеўрапейскага дэмакратычнага працэсу, і ў той жа час звязвае свае перспектывы з Саюзам Беларусь-Расія, які адкрыты і для іншых краін. Адсюль складанасць і непаразуменне ўзаемаадносін з Саветам Еўропы.

Дэмакратыя ў Рэспубліцы Беларусь развіваецца па законах пераходнага грамадства. Утвораны ўсе інстытуты дэмакратычнай краіны, устаноўлены сувязі з асноўнымі міжнароднымі арганізацыямі. Разам з гэтым беларускае грамадства пераадольвае аб'ектыўныя і суб'ектыўныя цяжкасці палітычнага і эканамічнага характару.

Гэта знаходзіць адлюстраванне ў сродках масавай інфармацыі, якія з'яўляюцца адначасова паказчыкам узроўню дэмакратыі і механізмам яе развіцця. У дыялектычнай злучнасці камунікацыйных плыняў з сучаснай рэчаіснасцю фарміруецца новая грамадскасць і новая сістэма камп'ютарнай камунікацыі.

Такім чынам філасофія сучаснай дэмакратыі ўвасабляе гуманістычны вопыт чалавецтва і пазначае новы - трэці шлях развіцця цывілізацыі ў XXI ст.

### *Тэма 2. Ідэалагічныя інстытуты сучаснай палітычнай сістэмы і іх уплыў на фарміраванне новай інфармацыйнай прасторы*

Ідэалагічныя інстытуты суверэннай краіны (дзяржава, партыі, судовая ўлада, грамадскія аб'яднанні і інш.) з'яўляюцца тэхналагічнымі звеннямі здзяйснення дэмакратычных законаў. Іх узаемадзеянне - гэта супярэчлівы, канфліктны і шматгранны працэс сацыяльна абвостранай барацьбы за палітычны ўплыў на насельніцтва.

На Беларусі палітычны працэс не атрымаў свайго завяршэння ў эканоміцы і здзяйсняецца без грунтоўнай распрацоўкі сацыяльна-эканамічных праграм. На гэтай падставе дамінантай у грамадскай свядомасці з'яўляецца дзяржаўная палітыка сацыяльна арыентаванай эканомікі, што вызывае суб'ектыўныя супярэчнасці ў стратэгіі і тактыцы дзейнасці палітычных партый.

Найбольш шырокім каналам сувязі з грамадствам з'яўляюцца сродкі масавай інфармацыі. Яны радыкальна адлюстроўваюць палітыка-эканамічныя падзеі і з'явы і ў гэтым аб'ектывісцкім працэсе праяўляюцца негатыўныя тэндэнцыі, моцна ўплываючыя на масавую свядомасць. Рэальнае жыццё ў камунікатыўных каналах не супадае з палітычнымі дэкларацыямі, пагэтаму інфармацыя дзяржаўных СМІ ўспрыймаецца ў асноўным як абавязковае паведамленне, а грамадскія газеты - як займальнае чытанне.

Палітычныя інстытуты Беларусі адлюстроўваюць развіццё дэмакратыі ў перманентным стане яе развіцця.

### *Тэма 3. Трансфармацыя свабоды слова — адзін з галоўных фактараў умацавання дэмакратычнага грамадства*

Дэмакратычныя свабоды — гэта ідэал, да якога імкнецца грамадства. І ў працэсе карыстання свабодай асоба і грамадства пераадольваюць аб'ектыўныя і суб'ектыўныя супярэчнасці. У гэтым праяўляецца логіка гістарычнага працэсу: свабоду, і асабліва свабоду слова, неабходна пастаянна абараняць.

Дэмакратыя як вышэйшая форма ўсталявання грамадства адкрыта ўжо больш двух тысячагоддзяў, аднак яна не атрымала сусветнага практычнага ўвасаблення. Акрамя таго, і ў краінах сталай дэмакратыі свабода слова знаходзіцца пад пільным наглядам з боку дзяржавы і судовай улады. Гэта звязана з тым, што свабода слова ўступае ў канфлікт з кансерватызмам дзяржавы выражэннем ідэй, шырынёй кругазору, паглыбленым аналізам рэчаіснасці, крытычным поглядам на дзейнасць упраўленчых структур.

Такім чынам свабода слова – гэта сацыяльны канфлікт у кожным канкрэтным гістарычным перыядзе; найвышэйшая мера дэмакратыі, якая дазваляе кожнаму грамадзяніну адчуваць свае правы і адказнасць у грамадстве; самы эфектыўны аналітычны метад экспертызы рэчаіснасці, дзейнасці ўпраўленчых структур і функцыяніравання дзяржавы.

У Беларусі свабода слова таксама праходзіць перыяд палітычнага выпрабавання. Ідзе эвалюцыя гэтага дэмакратычнага закона ад монапартыйнага становішча да карыстання ўсім грамадствам. На гэтым шляху свабода слова сустракае значныя перашкоды і абмежаванні, хаця яны забаронены Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і законам аб друку.

Наколькі хутка журналісты авалодаюць механізмам раўнавагі свабоды і адказнасці – ад гэтага ў грамадстве залежыць працэс станаўлення дэмакратычнай краіны. Тады свабода творчасці стане моцнай, стваральнай, а не раз'яднальнай сілай, і напрамую будзе ўплываць на развіццё эканомікі, палітыкі і культуры.

### *Тэма 4. Фарміраванне новай культурнай прасторы — фактары, прынцыпы ўзаемадзеяння ў постіндустрыяльным грамадстве*

Інфармацыйная прастора – гэта сфера камунікацыйных плыняў суверэннай краіны, якія забяспечваюць яе міжнародны статус і ўнутраннае палітычнае, эканамічнае і культурнае развіцце. Інфапрастора мае свае

вызначальныя нацыянальныя рысы, яе магутнасць залежыць ад энергетычнага імпульса дзяржавы. Яна ўплывае на міжнароднае прызнанне краіны, стварае аўтарытэт народу і звязана з нацыянальнай бяспекай Рэспублікі Беларусь.

У сучасны момант інфапрастора падвяргаецца моцнай заходне-усходняй камунікацыйнай экспансіі. Калі ўсходні ўплыў у асноўным супадае з запатрабаваннямі беларускага грамадства, то заходні — (амерыкана-еўрапейскі) мае эксплуатацыйныя намеры ў адносінах да нацыянальнай эканомікі і культуры.

Пераадоленне гэтай тэндэнцыі караніцца ва ўмацаванні нацыянальных традыцый і аднаўленні беларускай эканомікі на сусветным тэхналагічным узроўні.

Адным з галоўных фактараў эфектыўнасці інфапрасторы з'яўляецца дзейнасць сродкаў камунікацый. Чым шырэй інфармацыйная плынь, тым мацней энергетычны імпульс беларускай дзяржавы і нацыі на міжнароднай арэне, тым функцыянальней нацыянальная эканоміка, выразней і аўтарытэтней пазіцыя кіраўніцтва краіны.

Інфапрастора — гэта люстэрка дзяржавы ў інфармацыі, тэхналогія арганізацыі грамадства ў будучым.

## *Тэма 5. Умацаванне духоўнай асновы грамадзянскага супольства ў СМІ Рэспублікі Беларусь для сцвярджэння дэмакратычных прынцыпаў існавання дзяржавы*

Нацыянальная ідэя – гэта асэнсаванне нацыяй свайго існавання ў міжнародным супольстве і стварэнне спрыяльных і цывілізаваных умоў жыцця для кожнага грамадзяніна.

Гістарычна беларуская нацыянальная ідэя сфарміравалася на грунце ўтварэння роднай мовы, самастойнай нацыі і суверэннай дзяржавы.

У сучасны момант дзяржаўныя і грамадскія структуры імкнуцца абаперціся ў сваей дзейнасці на нацыянальную ідэю, як на аб'яднальную ідэалогію. Аднак нацыянальная ідэя значна шырэй за ідэалогію дзяржаўнасці: яна ідэал грамадства і кожны новы час вылучае новыя патрабаванні, якія ўкладваюцца ў рэчышча народных памкненняў.

Нацыянальная ідэя ў сродках інфармацыі з выпадку яе слабага тэарэтычнага абгрунтавання фактычна не мае публіцыстычнага развіцця і часцей за ўсе служыць толькі палітычным фецішам у барацьбе нацыяналістычных груповак. У той жа час вера нацыі застаецца нязменнай па зместу і канчатковай мэце для розных часоў і палітычных сілаў і пагэтаму нацыянальная ідэя не можа быць мэтай барацьбы грамадскіх слаёў.

У сучасны перыяд развіцця беларускай нацыі складваюцца самыя спрыяльныя ўмовы для асэнсавання і практычнага асваення нацыянальнай ідэі - як асноўнага ідэала беларускага народа.

Асэнсаванне нацыянальнай ідэі з'яўляецца адной з важнейшых праблем маладой беларускай дэмакратыі.

### *Тэма 6. Развіццё тэорыі эфектыўнай дзяржавы, як галоўны фактар зместу ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. Адлюстраванне ў СМІ*

Дэмакратыя — гэта норма жыццяўкладу кожнага грамадзяніна, разам з тым гэта таксама найбольш справядлівая форма арганізацыі дзяржавы. У той жа час дэмакратыя — гэта своеасаблівая і агульнаўспрыймальная ідэалогія.

Для суверэннай Рэспублікі Беларусь дэмакратычная эпоха стварае спрыяльныя ўмовы для распрацоўкі ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці - сістэмы палітычных, эканамічных і маральна-этычных норм і прынцыпаў аб'яднання ўсяго народа дзеля росквіту асобы і дасягнення высокага матэрыяльнага ўзроўню грамадства.

Падмуркам ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці з'яўляецца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, нацыянальныя традыцыі і агульначалавечыя каштоўнасці. Але дзеля іх увасаблення кожным чалавекам неабходна распрацаваць зацікаўлены своеасаблівы маральны кодэкс, які будзе стымуляваць маральныя і фізічныя сілы нацыі, умацоўваць патрыятычныя аб'яднальныя пачуцці беларускага народа.

Нераспрацаванасць тэорыі ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці ставіць сродкі інфармацыі ў палемічны тупік. Публіцысты не маюць абгрунтаванага пункту гледжання на адну з магістральных магчымасцей выхаду Беларусі на цывілізаваны шлях развіцця.

ІБД складаецца  з двух частак: тэарэтыка-ідэалагічнай і тэарэтыка-эканамічнай. Ідэалогія - вера, але вера ў рэальнасць стварэння ў Беларусі ў кароткі тэрмін цывілізаваных умоў жыцця чалавека еўрапейскага ўзроўню.

### *Тэма 7. Эвалюцыя адлюстравання ў СМІ Беларусі праблемы ўстойлівага развіцця краіны на аснове законаў міжнароднага супрацоўніцтва*

Асноўныя мадэлі палітычнага ладу (сацыялізм-капіталізм) - эканамічнага (сацыялістычная, ліберальная і інш.) вычарпалі свае магчымасці. Для развіцця чалавецтва ў трэцім тысячагоддзі і вырашэння глабальных задач (энергетычнай, біялагічнай, экалагічнай, ядзернай і інш. бяспекі) неабходна здзейсніць пераход да наасферы акадэміка Вярнадскага.

Навуковыя даследаванні апошняга часу абгрунтоўваюць трэці шлях развіцця чалавецтва на аснове канцэпцыі ўстойлівага развіцця, упершыню абмеркаванай на канферэнцыі ААН у Рыа-дэ-Жанейра ў 1992 годзе. Яе змест наступны:

- пераход грамадства на атрыманне біялагічнай энергіі, экалагічна чыстую вытворчасць і забеспячэнне насельніцтва Зямлі прадуктамі харчавання;
- пераход да інфармацыйнага мыслення, вытворчасці і навуковага забеспячэння жыццядзейнасці чалавека, паступовае асваенне сярэдняй прафесійнай адукацыі і пераход да ўсеагульнай вышэйшай адукацыі ў развітых краінах;
- трэцяе тысячагоддзе - гэта эпоха міру, якая вымагае забараненне войн, поўнае разбраенне і знішчэнне ваеннай зброі.

Для Беларусі канцэпцыя ўстойлівага развіцця адкрывае вялікія эканамічныя магчымасці з улікам таго, што ў нас багатая прырода, пладародная

зямля, не разведаныя да канца прыродныя багацці, высокі інтэлект народа.

Ужо сёння магчыма і неабходна стварэнне новай эфектыўнай эканомікі (тэхнаполісы, свабодныя эканамічныя зоны, тэхнапаркі і інш.) паралельна з існуючымі эканамічнымі структурамі (па прыкладу Кітая) для паступовай іх замены новымі тэхналогіямі.

Канцэпцыя ўстойлівага развіцця — гэта ідэалогія інфармацыйнай эпохі.

## *Тэма 8. Дэмакратычны дыялог дзяржавы і грамадства ў камунікатыўнай сферы - асноўны прынцып пабудовы эфектыўнай дзяржавы*

Адэкватная перабудова камунікацыйных сістэм выклікам новага часу карэнным чынам змяніла іх змест і стыль дыялога з грамадствам. Ілюстрацыя супярэчлівай рэчаіснасці эвалюцыяніравала да крытычнага аналізу, фармуліроўкі новых ідэй, пераацэнкі гістарычных падзей і нацыянальных каштоўнасцей. Гэта пачатак фарміравання грамадскай свядомасці новага бесцэнзурнага часу. Дзейнасць журналістаў ажыццяўляецца ў сферы свабоды слова і грамадскай адказнасці за асабістую творчасць.

Разам з гэтым у змесце камунікацыйных каналаў былі нівеліраваны родавыя прызнакі грамадскага інстытута інфармацыі, культуры і сацыяльнай сувязі паміж людзьмі. Паступова гіпертрафіраваліся палітычная накіраванасць сродкаў інфармацыі і аслабла эканамічная функцыя, традыцыйна моцная ў беларускай журналістыцы.

Узрасла палемічнасць журналістыкі аднак амаль страчана аналітычнасць, публіцыстычнасць: інфармацыя стала асноўным жанрам сродкаў інфармацыі.

Змест СМІ супадае з развіццём дэмакратьтчнага працэсу ў Беларусі.

**Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны**

| № раздзела, тэмы, занятка | Назва раздзела, тэмы занятка; | Пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне занятка (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Лабараторныя заняткі | КСР | | | |
| **1** | **2** | | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **6** | **7** |
| **1.** | Навукова-тэарэтычныя асновы сучаснай дэмакратыі. | | 2 | **2** | | | | **1-3** | |
| **2.** | Ідэалагічныя інстытуты сучаснай палітычнай сістэмы і іх уплыў на фарміраванне новай інфармацыйнай прасторы. | | | **2** | | | | **1-3** | |
| **3.** | Трансфармацыя свабоды слова – адзін з галоўных фактараў умацавання дэмакратычнага грамадства. | | 2 | **2** | | | | **1-3** | |
| **4.** | Фарміраванне новай культурнай прасторы – фактары, прынцыпы ўзаемадзеяння ў постіндустрыяльным грамадстве. | | | **2** | | | | **1-3** | |
| **5.** | Умацаванне духоўнай асновы грамадзянскага супольства ў СМІ Рэспублікі Беларусь для сцвярджэння дэмакратычных прынцыпаў існавання дзяржавы. | | 2 | **2** | | **2** | | **1-3** | |
| **6.** | Развіццё тэорыі эфектыўнай дзяржавы, як галоўны фактар зместу ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. Адлюстраванне ў СМІ. | | | **2** | | | | **1-3** | |
| **7.** | Эвалюцыя адлюстравання ў СМІ Беларусі праблемы ўстойлівага развіцця краіны на аснове законаў міжнароднага супрацоўніцтва. | | 2 | **2** | | | | **1-3** | |
| **8.** | Дэмакратычны дыялог дзяржавы і грамадства ў камунікатыўнай сферы - асноўны прынцып пабудовы эфектыўнай дзяржавы. | | | **2** | | | | **1-3** | |
| | **Усяго** | | **10** | **14** | | **2** | | | **залік** |

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

1. Аб’ектыўная сутнасць рэфармавання сацыяльна-эканамічнага комплексу ў Рэспубліцы Беларусь.
2. Заканамернасці развіцця рыначнай эканомікі.
3. Асноўныя прынцыпы функцыянавання рыначнай эканомікі.
4. Інвестыцыйны працэс у беларускай эканоміцы і ў СМІ Рэспублікі Беларусь.
5. Праблемы энергетычных рэсурсаў эканамічнай рэформы ў Беларусі.
6. Эканамічная палітыка беларускага ўрада і яе адлюстраванне і аналіз у сродках інфармацыі. Рэспубліка Беларусь у замежным друку.
7. Аналіз у беларускіх СМІ міжнароднага вопыту рэфармавання эканомікі.
8. Эканамічная стратэгія функцыянавання дзяржавы ўстойлівага развіцця.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

**Асноўная:**


1. Слука, О. Г. Идеологические процессы в Беларуси: моногр. / О. Г. Слука. – Минск : РИВШ, 2010. – 218 с.
2. Слука, О.Г. СМИ Беларуси в условиях строительства социально ориентированной экономики/ О.Г. Слука//Минск: БГУ, 2011.– 57, [2] с.
3. Слука, О. Идеология информационного пространства Республики Беларусь / Олег Слука // Вестник БГУ. – Серия 4. – 2010. – №2


**Дадатковая:**


1. Белорусское самосознанне и белорусская политика. Свободная мысль. – 1996. – №1.
2. Борисов, В. К. Теория политической системы / В. К. Борисов. – М., 1991.
3. Ватуля, Т. А. Массовое самоопределение: социально-политический аспект / Т. А. Батуля. – Санкт-Петербург. – 1993.
4. Гісторыка-філасофскія асновы беларускай дзяржаўнасці. – Мінск, 2002.
5. Идеология белорусской государственности: проблемы теории и практики. – Минск, 1998.
6. Иноземцев, В. Л. Классовый аспект бедности постиндустриальных обществ / В. Л. Иноземцев / / Социологические исследования. – 2000. – № 8.
7. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. – Мн., 2004.
8. Лёсік, Я. Аўтаномія Беларусі / Я. Лёсік / / Спадчына. – 1990. – № 3. – С. 21.
9. Макиавелли, А. Избранные сочинения / А. Макиавелли. – М., 1992.
10. Мельник, В. А. Республика Беларусь: власть, политика, идеология / В. А. Мельник. – Минск, 1998.
11. Пайне, Р. Россия при старом режиме / Р. Пайне. – М., 1993.
12. Слука, А. Г. Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці: метадалогія фарміравання: манагр. / А. Г. Слука. – Мінск, 2007.
13. Слука, А. Г. Нацыянальная ідэя: манагр. / А. Г. Слука. – Мінск : РІВШ, 2008. – 364 с.
14. Слука, О. Г., Ермолицкий, М.. А.; Юркевич, А. Т. Идеология белорусской государственности / О. Г. Слука, М. А. Ермолицкий, А. Т. Юркевич / / «Республика». – 1996. – 8 июня.
15. Слука, О. Г. Методология формирования гражданского общества/ О.Г. Слука // Проблемы управления.– 2010. – №2

16. Слука, О. Г. Основы идеологии белорусского государства: метод. рекоменд. для студ. и преп. высших учеб. завед. / О. Г. Слука [и др.]. – Минск, 2009. – 63 с.
17. Сорокин, П. А. Социальные тенденции современности / П. А. Сорокин. – М., 1992.
18. Храмов, В. О., Криштапович, Л. Е. Беларусь: твой путь? / В. О. Храмов, Л. Е. Криштапович. – Минск, 1997.